**Білет 6**

**Практычнае заданне.**

**Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР у другой палове 1940-х – 1980-ыя гг.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Каму належала вышэйшая заканадаўчая і выканаўчая ўлада ў БССР у 1978-1991 гг.?
2. Якую ролю адыгрывала Камуністычная партыя ў грамадска-палітычным жыцці БССР у другой палове 1970-х - 1980-я гг.?
3. Якія асаблівасці гістарычнага шляху беларускага народа і грамадска-палітычнага жыцця рэспублікі ўвасобіліся ў Дзяржаўных сімвалах БССР?
4. Складзіце схему: Формы ўдзелу грамадзян БССР у грамадска-палітычным жыцці рэспублікі.

**I. З Канстытуцыі БССР (1978 г.)**

Артыкул 1. Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка ёсць сацыялістычная агульнанародная дзяржава, якая выражае волю і інтарэсы рабочых, сялян і інтэлігенцыі, працоўных рэспублікі ўсіх нацыянальнасцей.

Артыкул 2. Уся ўлада ў Беларускай ССР належыць народу. Народ ажыццяўляе дзяржаўную ўладу праз Саветы народных дэпутатаў, якія складаюць палітычную аснову Беларускай ССР.

Артыкул 6. Кіруючай і накіроўваючай сілай савецкага грамадства, ядром яго палітычнай сістэмы, дзяржаўных і грамадскіх арганізацый з'яўляецца Камуністычная партыя Савецкага Саюза. […]. Узброеная марксісцка-ленінскім вучэннем, Камуністычная партыя вызначае генеральную перспектыву развіцця грамадства, лінію ўнутранай і знешняй палітыкі СССР; кіруе вялікай стваральнай дзейнасцю савецкага народа, надае планамерны, навукова абгрунтаваны характар яго барацьбе за перамогу камунізму.

Артыкул 7. Прафесійныя саюзы, Усесаюзны Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі, кааператыўныя і іншыя грамадскія арганізацыі ў адпаведнасці са сваімі ўстаўнымі задачамі ўдзельнічаюць у кіраванні дзяржаўнымі і грамадскімі справамі, у рашэнні палітычных, гаспадарчых і сацыяльна-культурных пытанняў.

Артыкул 97. Вышэйшым пастаянна дзеючым органам дзяржаўнай улады Беларускай ССР з'яўляецца Вярхоўны Савет Беларускай ССР.

Артыкул 115. Савет Міністраў Беларускай ССР – Урад Беларускай ССР – з'яўляецца вышэйшым выканаўчым і распарадчым органам дзяржаўнай улады Беларускай ССР.

Артыкул 124. Органамі дзяржаўнай улады ў абласцях, раёнах, гарадах, раёнах у гарадах, пасёлках, сельскіх населеных пунктах з'яўляюцца адпаведныя Саветы народных дэпутатаў.

**II. Удзел насельніцтва БССР у грамадска-палітычным жыцці** *(па матэрыялах вучэбнага дапаможніка "Гісторыя Беларусі. 1917 г. – пачатак XXI ст. 9 клас").*

Грамадская актыўнасць насельніцтва БССР была дастаткова высокай. Спрыяльным фактарам у фарміраванні становучых адносін жыхароў рэспублікі да ўдзелу ў грамадска-палітычным жыцці і палітыцы партыі з'яўлялася павышэнне ўзроўню жыцця насельніцтва. Немалаважнае значэнне мела і дзейнасць партыйных і дзяржаўных кіраўнікоў.

Грамадзяне БССР удзельнічалі ў выбарах і рабоце Саветаў народных дэпутатаў, партыйных, прафсаюзных, камсамольскіх і іншых грамадскіх арганізацый.

У БССР, таксама як і ў іншых савецкіх рэспубліках, рэгулярна арганізоўваліся масавыя сходы, мітынгі, грандыёзныя вулічныя шэсці, прысвечаныя святкаванню дзён Кастрычніцкай рэвалюцыі і Першага мая, Перамогі і вызваленню БССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. З вялікай урачыстасцю адзначаліся ленінскія дні, знамянальныя даты ў гісторыі КПСС, выбары ў Саветы народных дэпутатаў, прыняцце новай Канстытуцыі СССР 1977 г. і Канстытуцыі БССР 1978 г.

**III. Дзяржаўныя сімвалы БССР**

| | |
|---|---|
| <br>**Дзяржаўны сцяг БССР**<br>**у 1951—1991 гг.** | **З Дзяржаўнага гімна БССР**<br>Сл. М. Клімковіча, муз. Н.Сакалоўскага<br>Мы, беларусы, з братняю Руссю<br>Разам шукалі к шчасцю дарог.<br>У бітвах за волю, у бітвах за долю<br>З ёй здабылі мы сцяг перамог!<br>Нас аб'яднала Леніна імя,<br>Партыя к шчасцю вядзе нас у паход.<br>Партыі слава! Слава Радзіме!<br>Слава табе, беларускі народ! |